ларускіх народных песень Гродзеншчыны...» з нотамі (2002). Зборнік дае малюнак бел. нар. песеннай творчасці рэгіёна, паказвае яго слоўна-паэтычную і музычную адметнасць. Шэраг песень зарэгістраваны ўпершыню («Там, на гары», «У астравах ахотнік»). Пададзены і распаўсюджаныя нар. песні, але з адметнай мясцовай мелодыкай («Канцы грэблі шумяць вербы», «Ой, з гары едуць мазуры», «Даліна, далінушка»). У кнігу ўключаны «жорсткія» рамансы з даўняга гарадскога руска-бел. рэпертуару («Граю, граю на гітары», «Прыстройся, дзяўчына», «Гарыць лямпа дый тлеіцца»). У выданні як фалькл. творы прадстаўлены заходнебеларускія песні аўтарскага паходжання («Адвеку мы спалі», «Беларускаю рукою»). Апрацоўкі зроблены з разлікам на выкананне ў дзіцячых музычных школах і мастацкіх вучылішчах.

*А. Ч. Лойка, А. М. Пяткевіч.*

**БЕ́ДНАЯ КУЦЦЯ́**, гл. ў арт. *Куцця*.

**БЕ́ЗДЗЕЖСКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНА-ЭТНАГРАФІ́ЧНЫ ГУРТ «КУПА́ЛІНКА»** сельскага Дома культуры Драгічынскага раёна. Заснаваны ў 1987, з 1991 народны. Кіраўнікі: В.Валковіч і С.Кочык (з 1987), І.Каласей (з 1991), Л.Шалынук (з 2003). Гурт працуе ў вакальным жанры. У рэпертуары бел. каляндарна-абрадавыя («Пара, маці, жыта жаці», «Ой, на гары ніўка», «Цяпер у нас Дажыначкі»), вясельныя («За гарамі, за далінамі», «Ехала маладая з-пад вянца», «Каравай, каравай, я цябе ўбіраю»), салдацкія («Шоў са службы салдат малады», «Куды, Ваня, ідзеш, куды ад'язджаеш»), жартоўныя («Сымэн», «Ой хадзіла па садочку, і зламала ёлку») і інш. песні, якія выконваюцца а капэла ці пад акампанемент баяна і бубна. Калектыў мае касцюмы, выкананыя ў мясцовай традыцыі. Гурт — дыпламант Рэгіянальнага фестывалю бел. нар. харэаграфіі «Палескі карагод» (г. Пінск, 1991), Рэспубліканскага свята «Дажынкі» (г. Столін, 1996), абласнога фалькл.-этнаграфічнага фестывалю «Талакуха на Бярэсці» (г. Баранавічы, 2001). У тэлепраграме «Запрашаем на вячоркі» паказваў вясельны абрад.

*С. С. Авадок.*

*Бездзежскі народны фальклорна-этнаграфічны гурт «Купалінка».*



**БЕЛАБО́Г**, Белы Бог, мяркуемы персанаж славянскай міфалогіі, увасабленне белых (добрых) сіл; Бог удачы і шчасця. Супрацьлегласць Б. — *Чарнабог*. Некаторыя даследчыкі язычніцтва (А.Брукнер, В.Нерынг, С.Урбаньчык і інш.) лічылі імя Б. выдуманым, узнікшым пад уплывам літаратурных рэмінісцэнцый або познім запазычаннем з нямецкай мовы. Інш. славісты (А.Афанасьеў, Л.Нідэрле, В.Іванаў і У.Тапароў) лічылі або лічаць рэканструкцыю імя Б. дастаткова абгрунтаванай. У некаторых працах па бел. міфалогіі з Б. прынята атаясамліваць *Белуна*, вядомага па запісах фальклярыстаў 19 ст.

*Літ.*: Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье. Мн., 1993. С. 272 [рэпр. выд. СПб., 1882].

*Э. М. Зайкоўскі.*

**«БЕЛАРУ́С»** («Bielarus»), штотыднёвая грамадска-палітычная, літаратурна-мастацкая і рэлігійна-асветніцкая газета. Выдавалася з 13(26).1.1913 да 30.7(12.8).1915 у Вільні на бел. мове (друкавалася лацінкай). Рэдактары-выдаўцы: А.Бычкоўскі, Б.Пачопка. Выступала за культурна-нац. адраджэнне Беларусі, развіццё бел. мовы, друкавала свецкія і рэлігійныя творы, арыентаваныя на беларусаў-католікаў. Публікавала нар. песні, казкі, паданні, этнаграфічныя нарысы, апісанні нар. гульняў і абрадаў, даследаванні па фальклоры, нар. псіхалогіі. Звяртала ўвагу на сувязь бел. фальклору і традыцыйных абрадаў з хрысціянствам, рэлігійнымі вобразамі і матывамі. Апублікавала фалькл. апрацоўкі «З беларускіх казак» (13.1 і 10.5.1913; 9.1. 1914), нар. «Жарты» (27.1.1913), «Загадкі», «Жарты і прыказкі» (1.3.1913), легенды пра волатаў (6.2.1914), запі-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ